**19.** Хлопчык убачыў на лузе шмат коней. Бабуля сказала: *“Паглядзі, унучак, гэта пасецца … коней”*. Якое слова прапушчана?



**А)** клін. **Б)** чарада. **В)** табун. **Г)** касяк. **Д)** зграя.

---

**20.** Вызначце з прапанаваных словы, у якіх літара ***ю*** абазначае два гукі:

*1) юнак; 2) пюрэ; 3) уюн.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**21.** Дадзены прыклады:

*1) сту..ка; 2) усме..ка; 3) до..ка.*

У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***ш***?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**22.** Выберыце з прапанаваных словы-сінонімы да прыметніка смелы:

*1) храбры; 2) багаты; 3) адважны; 4) разумны.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**23.** Які дзеяслоў прапушчаны ў прыказцы?

*Хто ў жніўні гуляе, той узімку … .*

**А)** адпачывае. **Б)** спіць. **В)** галадае. **Г)** плача. **Д)** радуецца.

---

**24.** Суаднясіце назвы з малюнкамі:

*1) слоік; 2) граблі; 3) скаварада.*

*а)*  *б)*  *в)* 

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-в, 3-а.
**Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Інтэлектуальныя спаборніцтвы «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 2. Тыраж 16650 экз. Мінск. 2026 г.

# Конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2026»

*Чацвер, 12 лютага 2026 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Якую літару ў слове *елка* неабходна замяніць на літару ***ё***, каб атрымалася назва дрэва, упрыгожанага ў пакоі на Новы год?



**А)** не трэба замяняць. **Б)** е. **В)** л. **Г)** к. **Д)** а.

---

**2.** Уважліва прачытайце сказ:

*За дабро дабром плаціць трэба.*

Падлічыце, колькі слоў маюць літару ***р***.

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**3.** Якія з прапанаваных словы маюць два склады:

*1) вольха; 2) таполя; 3) вярба?*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**4.** Як называецца першы месяц вясны?

**А)** сакавік. **Б)** чэрвень. **В)** верасень. **Г)** снежань. **Д)** люты.

**5.** Дадзены прыклады:

*1) госць; 2) гусі; 3) рысь; 4) алені.*

Выберыце назоўнікі ў форме адзіночнага ліку.

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**6.** Прачытайце ўважліва радкі з народнай калыханкі:



*Ціха, кіска, ціха, братка,*
*У калысцы спіць **дзіцятка**.*

На якое пытанне адказвае выдзеленае слова?

**А)** хто? **Б)** што робіць? **В)** што? **Г)** каго? **Д)** каму?

**7.** У якім склоне ўжыты выдзелены ў прыказцы назоўнік?

***Навука** даражэй за ўсякае багацце.*

**А)** у назоўным склоне. **Б)** у родным склоне.
**В)** у давальным склоне. **Г)** у вінавальным склоне.
**Д)** у творным склоне.

**8.** Колькі дзеясловаў у прыказцы?

*Жнівень сее, жне і косіць – на сталах багацця досыць.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**9.** Дадзены прыклады:

*1) кан..кі; 2) бул..ён; 3) лос.. .*

Назавіце словы, у якіх напішаце літару мяккі знак **ь**.

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**10.** Назавіце словы, у якіх ёсць ***[п]***:

*1) боб; 2) ліпа; 3) кіпень.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**11.** Закончыце сказ, не змяняючы форму слоў:



*Хлопчык намаляваў прыгожую … .*

**А)** птушку. **Б)** дрэва. **В)** возера. **Г)** лес. **Д)** карабель.

**12.** Дадзены прыклады: *1) пень; 2) кот; 3) дом.*

Якія словы маюць тры літары і тры гукі?

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**13.** Колькі назоўнікаў ужыта ў сказе?

*Купалле – цікавае беларускае народнае свята.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**14.** Якая назва месяца супадае ў напісанні і вымаўленні ў беларускай і рускай мовах?

**А)** люты. **Б)** сакавік. **В)** май. **Г)** ліпень. **Д)** снежань.

**15.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***ў***:

*1) ле..; 2) во..к; 3) па..за?*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

**16.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі Якуба Коласа:

*Ноч і вечар, дзень, світанне*
*Абняло ты, слова-краска.*

Колькі ўсяго назоўнікаў нельга падзяліць для пераносу?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**17.** Асіна, ліпа, сасна – гэта … .

**А)** расліны. **Б)** кветкі. **В)** кусты. **Г)** дрэвы. **Д)** травы.

**18.** Макар атрымаў заданне з пераблытаных літар скласці назвы птушак:

*1) лязюзя; 2) кілку; 3) дрзод; 4) белус; 5) сіцані.*

Знайдзіце сярод іх назву невялікай балотнай птушкі з доўгімі нагамі.

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.